*УДК 811.161.3’373.46:69*

**Бабровіч Таццяна Сяргееўна**, старшы выкладчык
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь
электронная пошта: *tanyabobrovich@yandex.by*

Babrovich Tatiana, senior lecturer
Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University, Minsk, Belarus
e-mail: *tanyabobrovich@yandex.by*

# ТЫПЫ ПОЛІВЕРБАЛЬНЫХ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫХ НАМІНАЦЫЙ БУДАЎНІЧАЙ СФЕРЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

*Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца полівербальныя найменні будаўнічай сферы з анамасіялагічных пазіцый, што дае магчымасць вылучыць у іх структуры анамасілагічны базіс і анамасіялагічную прыкмету, а таксама вызначыць тыпы.*
*Ключавыя словы: тэорыя намінацыі, тэрміналагічныя найменні, тып намінацыі, полівербальныя адзінкі, анамасіялагічны базіс, анамасіялагічная прыкмета.*

# TYPES OF POLYVERBAL TERMINOLOGICAL NOMINATIONS OF THE CONSTRUCTION INDUSTRY IN THE MODERN BELARUSIAN LANGUAGE

*Summary. The article considers the polyverbal names of the construction industry from onomasiological positions, which makes it possible to single out an onomasiological basis and an onomasiological feature in their structure, as well as to identify types.*
*Key words: nomination theory, terminological names, nomination type, polyverbal units, onomasiological basis, onomasiological sign.*

Працэс называння, які з’яўляецца прадметам тэорыі намінацыі, уяўляе сабой комплексную мыслёвую і маўленчую з’яву, у якой вылучаюць некалькі этапаў: этап вычлянення свядомасцю аб’екта, які трэба назваць, асэнсаванне таго, што абазначаецца, і выбар адэкватных моўных сродкаў наймення. У сувязі з гэтым пэўную цікавасць уяўляюць вытворныя найменні, у якіх магчыма ўстанавіць анамасіялагічную структуру. Анамасіялагічны аналіз намінатыўных адзінак дазваляе зафіксаваць асаблівасці намінатыўнай дзейнасці чалавека. Як паказваюць назіранні, такі аналіз прымянімы да вытворных універбаў (аднаслоўных найменняў), якія ўтвораны рознымі спосабамі, бівербальных і полівербальных найменняў.

Традыцыйна пры анамасіялагічным падыходзе за аснову бярэцца паняцце і вызначаецца, па-першае, якія найменні існуюць у мове для гэтага паняцця і, па-другое, якія сувязі паміж паняццем, назвай і абазначаемым

прадметам. Названы аналіз эфектыўна праводзіць з вызначэннем тыпаў найменняў. Вядома, што ў мовазнаўстве паняцці “тып” і “тыпалогія” ўжываюцца ў розных значэннях. Паводле меркавання У.Р. Гака, “тып” вызначаецца як “мадэль (узор), якому адпавядае акрэсленая група розных з’яў” [1, с.310]. Такімі з’явамі могуць выступаць моўныя адзінкі. Аналіз уласцівасцей і асаблівасцей функцыянавання прыводзіць да магчымасці групоўкі, выдзялення катэгорый, класаў такіх адзінак, а значыць да ўстанаўлення іх тыпаў.

Тэрмін “тыпалогія” можна вызначыць як “выяўленне і ўпарадкаванне розных тыпаў існавання аб’екта” [1, с.310]. На думку Т.Р. Трафімовіч, *тыпалогія* − гэта яшчэ і навуковы метад, які прымяняецца пры аналізе моўных фактаў і з’яў, паколькі валодае значнай тлумачальнай здольнасцю. Даследчык падкрэслівае, што з яго дапамогай магчыма выявіць анталагічныя ўласцівасці аб’ектаў, якія вывучаюцца, на аснове пэўных крытэрыяў вызначыць іх групы (тыпы) і вылучыць заканамернасці сістэмнай арганізацыі той ці іншай часткі мовы [2, с.2].

Неабходна адзначыць, што разам з паняццем “тып намінацыі” ў сучаснай анамасіялогіі ўжываюцца тэрміны “прынцып намінацыі”, “тыпы матываваных прыкмет”. М. Д. Голеў у выніку аналізу даследаванняў па анамасіялогіі прыходзіць да высновы, што розныя тэрміны абазначаюць адну і тую ж лінгвістычную з’яву – своеасаблівыя анамасіялагічныя мадэлі, з абагульненнем найбольш характэрных аспектаў і прыкметы, па якіх адбываецца намінацыя аднародных прадметаў [3, с. 17].

Пры выяўленні тыпаў найменняў важным з’яўляецца выдзяленне іх анамасіялагічнага базісу і анамасіялагічнай прыкметы. На думку У. Р. Гака, любы прадмет “характарызуецца мноствам прыкмет, уласцівасцей, адносін, іх немагчыма, ды практычна і не трэба выдзяляць усе ў працэсе намінацыі, і прадмет называецца па якой-небудзь адной або некалькіх яскравых прыкметах, якія рэпрэзентуюць увесь прадмет” [4, с. 20]. Калі анамасіялагічны базіс, які вызначае катэгарыяльную прыналежнасць наймення, заўсёды характарызуецца простай структурай, то анамасіялагічная прыкмета мае розную ступень ускладненасці. Так, паводле даследаванняў Т.Р. Трафімовіч, пад увагай знаходзіцца семантычная структуралізацыя паняцця, якая дае магчымасць прасачыць ход узнікнення вытворнага наймення ад больш высокіх да больш нізкіх узроўняў абстракцыі [2]. У сувязі з гэтым у якасці тыпалагізаванага параметра для пабудовы класіфікацыі тыпаў найменняў можа выступаць характар анамасіялагічнай прыкметы. Прадуктыўнасць тыпаў намінацыі і іх іерархія дазваляюць зрабіць вывад аб тым, якія паняцці пры выяўленні анамасіялагічнай прыкметы з’явіліся найбольш значнымі і прадуктыўнымі і як яны звязаны з універсальнымі канцэптуальнымі ўяўленнямі чалавека.

Вылучыць анамасіялагічную прыкмету магчыма для кожнага вытворнага найменне шляхам узнаўлення намінатыўнага суджэння. Яго аналіз дазваляе вызначыць анамасіялагічную прыкмету і ацаніць яе сутнасць. Т. Р. Трафімовіч у працы, прысвечанай старарускай прадметнай намінацыі, выдзяляе як найбольш тыповыя *агентыўную, аб'ектную, лакатыўную, пасесіўную* і *нумеральна-тэмпаральную* прыкметы [2, с.50]. Н. А. Дзерунова вылучае ў сваім даследаванні яшчэ і *кваліфікацыйны тып* [5]. А. А. Кажэўнікава, аналізуючы кампазіты рускай мовы XI – XVII ст.ст. рознай часцінамоўнай прыналежнасці, выдзяляе 8 складаных намінатыўных тыпаў: *акцыянальна-аб'ектны, акцыянальна-суб'ектны, атрыбутыўна-субстанцыянальны, акцыянальна-дэтэрмінантны, нумеральны, кампаратыўны, атрыбутыўна-дэтэрмінантны* і *атрыбутыўна-аб'ектны* [6]. Дастаткова падрабязнай з'яўляецца тыпалагізацыя кампазітных прадметных найменняў М. М. Міхалевіч, у аснову якой закладзены анамасіялагічныя катэгорыі прадметнасці (субстанцыянальнасці), дзеяння (акцыянальнасці), прыкметы (атрыбутыўнасці), акалічнасці (прыкметы дзеяння, стану або атрыбута), а таксама колькасці. Даследчык выдзяляе *аб'ектную групу, акцыянальную групу, якасна-атрыбутыўную групу, дэтэрмінантную групу* і *нумеральную групу* [7, с.57].

З улікам распрацаваных тыпалогій у дадзенай працы робіцца спроба разгляду анамасіялагічнай структуры найменняў будаўнічай сферы і вычлянення тыпаў паводле характару анамасіялагічнай прыкметы. Так, сярод субстантыўных тэрміналагічных адзінак былі вылучаны намінацыі, якія належаць да *акцыянальнага тыпу, аб'ектнага тыпу, лакатыўнага тыпу* і *кваліфікатыўнага тыпу*. Акрамя гэтага, у акцыянальным тыпе выдзяляюцца *акцыянальна-аб'ектны* і *ад'ектыўна-акцыянальны падтыпы*. Тыпы і падтыпы разглядаюцца ў сувязі са спосабамі намінацыі, дзе важную ролю адыгрываюць дэрывацыйныя сродкі. Т. Р. Трафімовіч падкрэслівае, што афіксы з'яўляюцца спосабам эксплікацыі анамасіялагічнага базіса і выражаюць катэгарызацыйную дзейнасць моўнай асобы пры намінацыі прадметаў навакольнай рэчаіснасці. Улік гэтых афіксаў дазваляе суаднесці іх з характарам анамасіялагічнай прыкметы і ўстанавіць, якія паводле значэння групы прадметных найменняў узніклі з дапамогай той ці іншай прыкметы і якія дэрывацыйныя сродкі выкарыстаны ў якасці базісаў пры гэтых прыкметах [2,с. 39]. У неаднаслоўных найменнях ролю анамасіялагічнай прыкметы выконваюць атрыбутыўныя кампаненты, прычым кожны новы атрыбутыўны кампанент называе новую прыкмету прадмета, які ўжо атрымаў назву пры дапамозе неаднаслоўнага наймення.

Аналіз фактычнага матэрыялу паказаў, што сярод неаднаслоўных найменняў пэўную групу складаюць трохслоўныя (полівербальныя) адзінкі. Як адзначае Л. М. Мінакова, "такія састаўныя найменні, блізкія па агульным значэнні да двухслоўных, дэталізуюць, удакладняюць пэўныя відавыя пры-

меты па розных паказчыках – характары прывядзення ў рух, ступені складанасці функцый, спосабе ўспрымання, прызначэнні, месцазнаходжанні і інш. Тэрміны адзначанага тыпу прадстаўлены вялікай колькасцю ў навукова-тэхнічнай тэрміналогіі” [8, с.51]. У такіх выпадках можна гаварыць пра множную анамасіялагічную прыкмету. Спалучэнні анамасіялагічных прыкмет могуць быць розныя.

У ходзе даследавання было прааналізавана 2654 тэрміналагічных словазлучэнняў будаўнічай сферы, якія ўваходзяць у тэматычныя падгруппы “*Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы*”, “*Будынкі, памяшканні*”, “*Будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы*”. Вызначыць дакладную колькасць полівербальных адзінак дастаткова складана у сувязі з высокай спалучальнасцю кампанентаў (у даследаванні вылучана такіх 67 адзінак).

Сярод будаўнічых тэрмінаў вылучаны наступныя групы полівербальных найменняў:

1) з кваліфікацыйнай і аб’ектнай прыкметай – *цэгла* ***белая сілікатная***; *лак* ***тлусты маслены***; *цеста* ***рэдкае цэментавае***; *сумесь* ***цвёрдая бетонная***; *вата* ***грануляваная мінеральная***; *блок* ***цыліндрычны анкерны***; *падлога* ***бясшоўная пластмасавая***; *матэрыял* ***азбеставы рулонны***; *матэрыял* ***дахавы рулонны***; *матэрыял* ***металакерамічны порысты***; *пліта* ***драўняная шматслойная***; *плітка* ***мазаічная шкляная***; *дэталь* ***будаўнічая тыпавая***; *кардон* ***ліставы будаўнічы***;

2) з аб’ектнай і лакатыўнай прыкметай – *абвязка* ***дзвярная гарызантальная***; *нага* ***вуглавая кроквенная***; *перакрыццё* ***паддашкавае металічнае***; *болт* ***анкерны скразны***; *панэль* ***сценавая драўляная***;

3) з кваліфікацыйнай і акцыянальнай прыкметай – *профіль* ***прэсаваны слаісты***; *памяшканне* ***цёплае ізаляцыйнае***; *дом* ***жылы вежавы***; *дом* ***жылы секцыйны***; *жалеза* ***ацынкаванае ліставое***;

4) з акцыянальнай і аб’ектнай прыкметай – *папера* ***азбеставая электраізаляцыйная***; *валакно* ***цеплаізаляцыйнае шкляное***; *сумесь* ***літая бетонная***; *ракавіна* ***усадачная металічная***; *бэлька* ***распорная драўляная***; *маса* ***шпаклёвачная гіпсавая***; *дошка* ***гіпсавая арміраваная***; *цэгла* ***гліняная абпаленая***;

5) з акцыянальнай і лакатыўнай прыкметай – *жолаб* ***вільчыкавы вадасцёкавы***; *дошка* ***зліўная падаконная***; *дошка* ***падлогавая струганая.***

Такім чынам, трохкампанентныя тэрміналагічныя адзінкі служаць вербальнымі сродкамі выражэння рода-відавых адносін паміж паняццямі, а паняцці могуць мець некалькі відавых характарыстык. Полівербальныя найменні фіксуюць большую колькасць прыкмет, утвараюцца на базе або бівербальных найменняў, або шляхам пераўтварэння аднаслоўнай адзінкі ў мнагаслоўную, утвараючы новыя назвы. Полівербальныя тэрміналагічныя найменні з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для вывучэння спосабаў эксплікацыі прадметна-пазнавальнай дзейнасці чалавека, актаў другаснай намінацыі, прыёмаў выкарыстання ў іх камбінаторнай тэхнікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Гак В. Г. Языковые преобразования. М. : Яз. рус. культуры, 1998. 768 с.
2. Трофимович Т. Г. Типы предметных наименований в языке старорусской письменности. Минск : Изда-во БГПУ, 2003. 215 с.
3. Голев Н. Д. О некоторых общих особенностях принципов номинации в диалектной лексике флоры и фауны // Русские говоры Сибири / Томск. гос. ун-т. Томск, 1981. С. 17–21.
4. Гак В. Г. К проблеме соотношения языка и действительности // Язык и действительность : сб. науч. тр. М., 2007. С. 16–26.
5. Дерунова А. А. Названия документов в русском деловом языке XI-XVII вв.: становление и развитие номинативной категории, типы наименований : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.02. Минск, 2015. 24 с.
6. Кожевникова А. А. Типология сложных слов в языке русской неделовой письменности XI-XVII вв. (ономасиологический аспект) : дис. … канд. филол. наук : 10.02.02. Минск, 2007. 125 л.
7. Михалевич М. М. Типы композитных предметных наименований в русском и английском языках: ономасиологический аспект : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.20 / Белорус. гос. пед. ун-т. Минск, 2017. 25 с.
8. Мінакова Л. М. Беларуская навукова-тэхнічная тэрміналогія: фарміраванне, функцыянаванне, развіццё : манаграфія. Гомель, 2004. 146 с.